**Білет 16**

**Практычнае заданне.**

**Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі ў Беларусі і іх значэнне.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Якія задачы Вярхоўнае камандаванне ўзброенымі сіламі Германіі ставіла сваёй арміі ў вайне з СССР?
2. Дзе ўлетку 1941 г. Чырвоная Армія вяла асноўныя абарончыя баі і наносіла контрудары па германскіх войсках? Пакажыце гэтыя месцы на картасхеме.
3. Прывядзіце факты, якія сведчаць аб правале германскага плана «маланкавай вайны» летам-восенню 1941 г.
4. У заходняй літаратуры асноўнымі прычынамі краху гітлераўскага плана «маланкавай вайны» называюць неспрыяльныя кліматычныя ўмовы і вялізныя тэрыторыі СССР. А якія прычыны правалу гітлераўскага плана "маланкавай вайны" можаце назваць вы? Якія крыніцы (прычыны) будучай Перамогі СССР у Вялікай Айчыннай вайне праявіліся ўжо ў абарончых баях летам 1941 г.?

**I. З Дырэктывы № 21 Вярхоўнага камандавання ўзброенымі сіламі Германіі (план «Барбароса»).** *18 снежня 1940 г.*

«Германскія ўзброеныя сілы павінны быць гатовы разбіць Савецкую Расію падчас кароткачасовай кампаніі <…>.

Асноўныя сілы рускіх сухапутных войскаў, якія знаходзяцца ў Заходняй Расіі, павінны быць знішчаны ў смелых аперацыях з дапамогай глыбокага, хуткага вылучэння танкавых клінаў. Адступленне баяздольных войскаў праціўніка на шырокія прасторы рускай тэрыторыі павінна быць прадухілена.

… Кірунак галоўнага ўдару павінен быць на поўнач ад Прыпяцкіх балот. Тут трэба засяродзіць дзве групы армій. ...На поўначы – хутка выйсці да Масквы. Захоп гэтага горада азначае вырашальны поспех…».

**II. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г.** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны»)*

Германскае камандаванне рабіла стаўку на стратэгію «бліцкрыгу» («маланкавай вайны»), якая цалкам апраўдала сябе ў вайне на Захадзе. У ходзе рэалізацыі плана «Барбароса» германскі вермахт планаваў да 15 жніўня дасягнуць Масквы і авалодаць Данецкім басейнам, а да 1 кастрычніка 1941 г. завяршыць ваенную аперацыю супраць СССР.

Насмерць, да апошняга патрона стаялі на сваіх рубяжах байцы пагранічнай заставы ў Брэсцкай крэпасці. Начальнікам заставы быў лейтэнант Андрэй Кіжаватаў. Дапамагалі абаронцам Брэсцкай крэпасці выхаванцы палкоў - 12-15-гадовыя падлеткі. Хлопцы прабіраліся ў напаўразбураныя склады за боепрыпасамі і прадуктамі, здабывалі пад артабстрэлам так неабходную ваду, перадавалі данясенні і вялі назіранне. <…>

Сярод абаронцаў Брэсцкай крэпасці былі прадстаўнікі больш як 30 нацыянальнасцей і народнасцей Савецкага Саюза. Штаб абароны крэпасці ўзначалілі ўраджэнец Разанскай губерні капітан Іван Зубачоў і ўраджэнец Віцебшчыны палкавы камісар Яўхім Фамін <…>

Брэсцкі гарнізон пратрымаўся каля месяца, хаця германскае камандаванне планавала ўзяць крэпасць да сярэдзіны дня 22 чэрвеня. На сценах крэпасці яе абаронцамі былі зроблены надпісы: «Умрем, но из крепости не уйдем», «Я умираю, но не сдаюсь! Прощай, Родина. 20.VII.41 г.».

… 6 ліпеня 1941 г. паміж Віцебскам і Оршай адбылася адна з самых буйных танкавых бітваў пачатку Вялікай Айчыннай вайны. З дзвюх бакоў удзельнічала каля 1600 танкаў. За тры дні баёў савецкія механізаваныя карпусы прасунуліся да 40 км. Значныя страты былі нанесены ворагу, зніжана яго ўдарная сіла, замаруджаны тэмп прасоўвання на ўсход. Тым не менш 11 ліпеня 1941 г. немцы захапілі Віцебск.

З 3 па 26 ліпеня 1941 г. ішлі напружаныя баі ў раёне Магілёва, які стойка абаранялі войскі Заходняга фронту і байцы атрадаў народнага апалчэння. Непасрэдную абарону горада вяла 172-я стралковая дывізія пад камандаваннем генерал-маёра М. Т. Раманава. Два тыдні яна трымала абарону каля вёскі Буйнічы. Найбольш жорсткія баі адбываліся 12 ліпеня, у гэты дзень савецкія воіны знішчылі 39 танкаў і адбілі некалькі нападаў праціўніка.

Больш за месяц ішлі баі за Гомель. Горад абаранялі не толькі войскі Цэнтральнага фронту, але і 6700 апалчэнцаў, і каля 3 тыс байцоў знішчальных батальёнаў.

Нягледзячы на ўпартае супраціўленне войскаў Заходняга фронту, да пачатку верасня 1941 г. уся тэрыторыя Беларусі была захоплена ворагам.

Аднак групоўка армій «Цэнтр» з канца лета 1941 г. вымушана была прыпыніць наступленне. Гітлераўскі план «Барбароса» стаў даваць збоі.

**III. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. 22 чэрвеня – жнівень 1941 г.**


ЛАТВИЙСКАЯ ССР
ЛИТОВСКАЯ ССР
СЕВЕРО-ЗАПАДНЫЙ ФРОНТ
ЗАПАДНЫЙ ФРОНТ
ЦЕНТРАЛЬНЫЙ ФРОНТ
ЮГО-ЗАПАДНЫЙ ФРОНТ
УКРАИНСКАЯ ССР
ГЕРМАНИЯ
ГР.АРМ. "ЦЕНТР"
ГР.АРМ. "ЮГ"
ВИЛЬНЮС
МИНСК
БРЕСТ
БЕЛОСТОК
БАРАНОВИЧИ
ПИНСК
МОЗЫРЬ
ГОМЕЛЬ
МОГИЛЁВ
ВИТЕБСК
СМОЛЕНСК
ЧЕРНИГОВ
ВИЛЕЙКА
оборона Брестской крепости
части и соединения 3 и 10 А
4ТА (2 и 3 ТГр)
0 50 км
НАСЕЛЕННЫЕ ПУНКТЫ
МИНСК Столицы союзных республик СССР
БРЕСТ Центры областей СССР
Речица Прочие населенные пункты
ГРАНИЦЫ
государств к 1941 г.
союзных республик СССР
Положение сторон и рубежи обороны
к исходу 21 июня
на 28-29 июня
на 3 июля
на 9-10 июля
на 15 июля
на 15 августа
ВОЕННЫЕ ДЕЙСТВИЯ
Направления ударов немецко-фашистских войск
Направления контрударов советских войск
Направления ударов танковых армий и механизированных корпусов
Места окружений частей советской армии ("котлы")
Отход войск с боями, прорыв окружений
28.VI Даты захвата населенных пунктов немецко-фашистскими войсками
Территория, оккупированная нацистской Германией к 1941 г.
Принятые сокращения
А армия ТА танковая армия ТГр танковая группа